Народная трыбуна. – 2016. – № 46 (1345). – 11 лістапада



РАВЕСНІК

СПЕЦЫЯЛЬНЫ ВЫПУСК ДЛЯ МОЛАДЗІ • №22 (458)

НАДЗЕЯ БЕЛАЙ РУСІ

# ТАЛЕНТ і крэатыўнасць

*Напрыканцы мінулага тыдня ў Пінску адбыўся абласны этап VI рэспубліканскага конкурсу "Студэнт года"*



Фота Наталлі МІЛЕЎСКАЙ.

Праводзілі яго на базе Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта. І невыпадкова, бо студэнтка гэтай установы адукацыі Аляксандра Барысенка была пераможцай мінулагодняга абласнога этапа конкурсу. А сам конкурс, дарэчы, накіраваны на развіццё студэнцкіх ініцыятыў і праектаў, стварэнне ўмоў для самарэалізацыі моладзі ў галінах грамадскай дзейнасці, навукі, мастацтва і спорту, стымуляванне лідарскіх якасцей, павышэнне прэстыжу ведаў і папулярызацыю прафесіі.

Арганізатарамі гэтай маштабнай у жыцці студэнтаў вобласці восеньскай дзеі выступілі абласны камітэт ГА "БРСМ" і галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкама пры падтрымцы ўстаноў вышэйшай адукацыі Берасцейшчыны. Дарэчы, іх прадстаўнікі ўваходзілі ў склад кампетэнтнага журы, якое ўзначальваў першы сакратар абласнога камітэта грамадскага аб'яднання "Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі" Віктар Іваноў.

Вялікая актавая зала ўніверсітэта была запоўнена студэнтамі-балельшчыкамі кожнага з чатырох удзельнікаў спаборніцтваў. Групы іх падтрымкі раз-пораз скандзіравалі імёны фіналістаў. За права прадстаўляць вобласць на рэспубліканскім этапе змагаліся: Карына Цялюшчанка (Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт), Мікалай Вабішчэвіч (Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна), Анастасія Лукашэвіч (Палескі дзяржаўны ўніверсітэт) і Раман Шухно (Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт). Яны былі выбраны з некалькіх тысяч студэнтаў.

Заўважу, не кожны малады чалавек мае дасягненні, якія ў паслужным спісе фіналістаў. Тая ж Карына Цялюшчанка ***(на здымку)*** сумяшчае вучобу з грамадскай і навуковай дзейнасцю: удзельнічае ў харавым акадэмічным калектыве "Белая вежа", у калектыве эстраднага танца "Эдэльвейс" і народнага танца "Крутуха".

Раман Шухно – староста групы, удзельнік інтэлектуальна-творчага аб'яднання ўніверсітэта "Школа лідара "Творчы актывіст XXI стагоддзя", старшыня каардынацыйнага савета лідараў студэнцкага самакіравання.

Мікалай Вабішчэвіч – лаўрэат дыплома І ступені рэспубліканскага фестывалю мастацкай творчасці навучэнскай і студэнцкай моладзі "Арт-вакацыі", намінант рэспубліканскага конкурсу літаратурнай творчасці студэнтаў "Аўтограф", фіналіст конкурсу "Новыя імёны Беларусі-2016".

І, нарэшце, Анастасія Лукашэвіч. Не адзін год з'яўляецца членам грамадскага рэспубліканскага студэнцкага савета пры міністры адукацыі Беларусі, членам гарадскога студэнцкага парламента. Яна пераможца многіх рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў. Дарэчы, усе фіналісты – студэнты 4-га курса.

Напачатку кожны з іх прадставіў на суд журы і гледачоў відэаролік для конкурсу самапрэзентацыі "Я – студэнт!". Інтэлектуальны конкурс "Мая краіна – Беларусь!" патрабаваў хуткіх і дакладных адказаў, напрыклад, на такія пытанні: "Вашы рэформы ў сістэме адукацыі, калі б вас назначылі міністрам адукацыі"; "Інавацыі ў жыцці студэнтаў, калі б вы былі рэктарам універсітэта"; "Тэзісы вашай праграмы як кандыдата ў дэпутаты" і іншыя. Адказы фіналістаў былі грунтоўнымі і выклікалі дружныя апладысменты залы. Як, між іншым, і прэзентацыі кніг "Крыніцы мудрасці". Гэты конкурс патрабаваў прэзентаваць адзін з беларускіх літаратурных твораў.

А фінальны конкурс "Беларусь культурная" дэманстраваў талент і ўменне канкурсантаў. Як адзначыў напрыканцы Віктар Іваноў, сёлетні конкурс вызначыўся сваім патрыятычным накірункам: гаварылі і спявалі на беларускай мове, а літаратурныя творы і песні былі пра Беларусь.

Не магу не сказаць і пра цудоўныя канцэртныя нумары навучэнцаў усіх чатырох універсітэтаў, якія прыгожа аздаблялі праграму конкурсу.

Кожны фіналіст быў годны звання пераможцы. Ды кампетэнтнае журы доўга захоўвала інтрыгу. Спачатку назвалі пераможцу ў намінацыі "Студэнт ONLINE" – Карыну Цялюшчанка, карыстальнікі сацыяльных сетак прагаласавалі за яе відэаролік з самапрэзентацыяй. "Гарманічнай асобай" стаў Мікалай Вабішчэвіч. У намінацыі "За волю да перамогі" вызначыўся Раман Шухно, а ў намінацыі "За ўменне ўвайсці ў вобраз" – Анастасія Лукашэвіч.

І вось старшыня журы агучвае імя пераможцы – Карына Цялюшчанка з Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта (дарэчы, такое дасягненне адбылося ўпершыню ў гісторыі гэтай навучальнай установы). Дзяўчына і будзе прадстаўляць Берасцейшчыну ў фінале рэспубліканскага конкурсу. Спадзяёмся на яе поспех. І маем падставу для гэтага: у 2014 годзе пераможцай стала наша, берасцейская, удзельніца – студэнтка Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта Аляксандра Малаканава.

**Марыя ЛЯШУК, "НТ",**
г. Пінск.

**Працяг тэмы – на 10-й стар. ("Крайнасці поспеху").**